жр 3213

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Сацыялістычная ВЕСКА

Орган Глускага РК КП(б)Б

№ 1 (1103) Субота, 22 жніўня 1943 г.

Библиотека АН БССР

Прачытай і перадай другому

Партызаны і партызанкі! У адказ на загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага МАРШАЛА СОВЕЦКАГА СОЮЗА ТАВАРЫША СТАЛІНА і поспехі Чырвонай Арміі яшчэ больш, яшчэ бязжаласней знішчайце нямецкіх акупантаў!

ЗАГАД
Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

15 жніўня гэтага года ў рэзультаце жорсткіх баёў 16 і 84 ГВАРДЗЕЙСКІЯ СТРАЛКОВЫЯ ДЫВІЗІІ вызвалілі горад КАРАЧЭЎ ад нямецкіх захопнікаў, паказаўшы пры гэтым прыклады мужнасці і ўмелых баявых дзеянняў. У адзнаку дасягнутых поспехаў 16 і 84 Гвардзейскім стралковым дывізіям, 238 і 369 стралковым дывізіям, вызваліўшым горад КАРАЧЭЎ прысвоіць назву „КАРАЧЭЎСКІХ" і ўдальнейшым іх называць:

16 Гвардзейская Карачэўская стралковая дывізія, 84 Гвардзейская Карачэўская стралковая дывізія, 238 Карачэўская стралковая дывізія, 369 Карачэўская стралковая дывізія.

ВЯРХОЎНЫ ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧЫ МАРШАЛ СОВЕЦКАГА СОЮЗА.

І. СТАЛІН.

15 жніўня 1943 года.

На франтах Айчыннай вайны
ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ПРАДАЎЖАЕ ГНАЦЬ НЕМЦАЎ НА ЗАХАД

Фронт наступлення нашых войск расшырыўся больш чым на 500 км. Выбіўшы нямецкіх акупантаў з Спас-Дземенскага плацдарма, Совецкія войскі прасоўваюцца наперад і вызваляюць усе новыя і новыя насялёныя пункты. Страціўшы выгадныя для абароны рубяжы, немцы нясуць вялізарныя страты ў жывой сіле і тэхніцы. За 16 і 17 жніўня на гэтым участку было знішчана больш 5000 нямецкіх салдат і афіцэраў, да 100 гармат, каля 30 танкаў, захоплены трафеі і палонныя.

Наступленне нашых войск у раёне Спас-Дземенска вельмі аслабіла пазіцыі немцаў у паўночным сэктары Бранскага напрамку. 16 жніўня на гэтым участку нашы войскі занялі горад Жыздру, зяўляўшуюся сільна ўмацаваным узлом немцаў. Паўночней, усходней і паўдзённей Бранска нашы войскі працягваюць паспяхова прасоўвацца наперад. 17 жніўня на гэтых напрамках занята звыш 190 насялёных пунктаў. 18 жніўня баі ішлі ў 30 кілометрах на ўсход ад Бранска.

На Харкаўскім напрамку працягваюцца жорсткія наступаючыя баі нашых войск.

Страціўшы важнейшыя камунікацыі на захад і паўднёвы захад ад Харкава, немцы апынуліся ў цяжкім становішчы. Цяпер яны безпаспяхова стараюцца звярнуць страчаныя пазіцыі, але пад ударамі нашых войск вымушаны адступаць назад, нясучы пры гэтым вялізарныя страты. Асабліва цяжкія страты панеслі немцы тут 16 і 17 жніўня. За гэтыя 2 дні нашы воіны знішчылі тут да 7000 гітлераўцаў, 80 нямецкіх танкаў, большасць з якіх танкі тыпа „Тыгр".

Страты немцаў на столькі вялікі, што яны самі не могуць утаіць гэтага факта. Берлінское інфармацыйнае бюро паведаміла, што на аднаго забітага на ўсходнім фронце прыходзіцца 9-10 раненых.

Ні грама хлеба нямецкім акупантам

Больш двух год нямецкія бандыты топчуць свяшчэнную зямлю нашай Беларусі. Яны ператварылі нашу квітнеючую рэспубліку ў суцэльны канцэнтрацыйны лагер.

Яны разрушылі нашы гарады, прадалі агню нашы вёскі Але ні агнём ні мячом не удалося фашысцкім канібалам пакарыць свабодалюбівы беларускі народ. На бясчынсты немцаў беларускі народ адказвае жорсткай партызанскай барацьбой, паўсяднеўным і паўсямесным ростам партызанскіх атрадаў. Праваліліся разлікі немцаў узброенай сілай падавіць партызанскі рух. З каждым днём барацьба набывае ўсё больш жорсткі характар Няма і не будзе жыцця нямецкім акупантам на беларускай зямлі.

І вось немцы зараз ідуць на новыя зладзеянні. Яны хочуць канчаткова разарыць і аграбіць беларускі народ, забраць у беларускіх сялян хлеб ураджая гэтага года і паставіць насельніцтва Беларусі пад пагрозу галоднай смерці. Гэта прадстаўляе сур'ёзную пагрозу для самага існавання беларускага народу.

Але не быць гэтаму. Кожны селянін павінен надзейна схаваць свой хлеб, каб ён не дастаўся ворагу.

СЯЛЯНЕ! Ні грама хлеба не давайце нямецкім акупантам. Гэтым вы выратуяце насельніцтва ад пагрозы галоднай смерці і дапаможаце Чырвонай Арміі, якая набліжаецца к нам, ачысціць беларускую зямлю ад фашысцкай погані.

Няхай дохне праклятая нямчура. Смерць нямецкім акупантам!

жр 3213

Партызаны дапамагаюць сялянам убіраць хлеб

Партызаны брыгады т. Ч. аказваюць сялянам вялікую дапамогу ў уборцы ураджаю. Праведзена некалькі сходаў, на якіх унесена рад прапаноў, як найхутчэй правесці ўборку хлеба і захаваць яго ад нямецкіх акупантаў. Пасля гэтага пачалася гарачая ўборка на полі. Сяляне ўбіраюць хлеб па-ваеннаму.

Кожны земляроб зацікаўлены ў тым, каб ні адно зерня не засталося на полі ды захаваць яго, каб ні адзін грам хлеба не папаў у рукі ворагу. Калі надышла пара возкі снапоў з поля, партызаны арганізавалі звыш 90 падвод і дапамаглі сялянам вёскі С. звезці збожжа і заскірдаваць яго. Калгаснікі надзвычайна ўдзячны за аказаную ім дапамогу. Вялікая дапамога з боку партызан аказваецца і ў правядзенні малацьбы.

НЕМЦЫ ЗАБРАЛІ НАШ ХЛЕБ

Васкова-жоўтымі зрабіліся жытнія палеткі. Буйным коласам звісала да зямлі спелае зерня. Багатым ураджаем абяцала заплаціць зямля за нашу цяжкую працу.

Але ў час жніва наехалі ў нашу вёску нямецкія грабежнікі і прыгналі з сабой вялікую колькасць фурманак. Яны нагайкамі і прыкладамі выгналі ўсіх жанчын на поля і загадалі ім жаць. Усе снапы адразу клалі на вазы і звозілі ў свае гарнізоны. Каля 10 гаспадарак нашай вёскі аставілі нямецкія акупанты без кавалка хлеба.

Сяляне вёскі М.
Фёдар С. Васіль П. Васіль А.

Партызаны звярнулі жывёлу калгаснікам

Раніцай да вёскі А. падышлі немцы і паліцэйскія. Непадалёку ад вёскі пасвілася жывёла калгаснікаў. Выскачыўшы з лесу, грабежнікі занялі ўсіх кароў, авечак і пагналі ў свой гарнізон. Вестка аб заняцці жывёлы немцамі маланкай далятела да партызан атрада т. Г. Мужныя народныя мсціўцы перарэзалі дарогу гітлераўскім бандытам. Заўважыўшы партызан, гітлераўскія грабежнікі трусліва разбегліся. Партызаны прыгналі ўсіх кароў, авечак і звярнулі іх насельніцтву вёскі

Партызан атрада
Іосіф Ш.

Нямецкія эшалоны пад адкос

Партызаны атрада Б. наносяць сільныя ўдары па камунікацыях ворага. У ліпені арганізавана 4 крушэнні нямецкіх чыгуначных саставаў з жывой сілай, танкамі і боепрыпасамі. Знішчана 4 паравозы, 43 вагоны, 20 платформ. Пад абломкамі вагонаў забіта 170 фрыцаў. У гэтых аперацыях праявілі сябе партызаны Васіль Ш, Аляксандр Д, Пятро Р, Павел Л. і іншыя. Усе яны адважныя байцы, выдатныя падрыўнікі.

Днямі дыверсійная група гэтага атрада пад кіраўніцтвам Аляксандра Д. падарвала паміж вёскамі Л. і М. эшалон з жывой сілай, фуражом і коньмі праціўніка. Знішчана 1 паравоз і 22 вагона, забіта 140 салдат і афіцэраў і 136 коней.

У выніку крушэнняў рух на чыгунцы прыастаноўлен на дзесяткі гадзін.

Рыгор К.

* * *

За апошнія дні падрыўныя групы, пад кіраўніцтвам Івана І. з атрада тав. П. пусцілі пад адкос каля станцыі М. два варожых эшалона. Знішчана два паравозы, 18 вагонаў і 13 платформ. Пры крушэнні забіта 37 немцаў. Рух цягнікоў па чыгунцы затрыман на 45 гадзін.

Акрамя гэтага сіламі нашага атрада разбурана 1,5 кілометраў чыгуначнага палатна

Фёдар Ш.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Становішча у Італіі

Агенцтва Рэйтэр перадало, што становішча ў Італіі становіцца ўсё больш напружаным. Пасля налётаў авіяцыі союзнікаў на італьянскія гарады, італьянскія ўлады аддалі загад аб эвакуацыі насельніцтва з шэрагу гарадоў. У Мілане панує неапісуемая паніка. Эвакуацыя ператварылася ў гаравае бегства насельніцтва. Большасць заводаў у горадзе закрыта. Па ўсей краіне лічаць што ў бліжайшыя дні наступяць важнейшыя падзеі, якія ўгораццa з падзеннем Сіцыліі.

Ваенныя дзеянні Сіцыліі ў асноўным закончаны. Войскі саюзнікаў 17 жніўня ўступілі ў горад МЕСІНУ—канцы пункт вострава на стыку з мэрыком Італіі.

Упадак пресціжа Гітлера сярод яго васал

Фінскае радыё перадае, што наступленне рускіх абяцае ім вялікія перспектывы. Усяварона немцаў, па думцы фінскага радыё, ставіцца цяпер да пагрозу.

Румынскі друк таксама ілюстроўвае поўную разачараванасць румынскіх прыспешнікаў Гітлера.

Газета „Віаца" піша, што толькі цяпер Совецкая Расія паказала на што яна здольна. Яна абрушыла на „Ось" усю сваю моц, яе салдаты змагаюцца з невіданым геройствам. Страшна ўявіць сабе, што будзе, калі немцы не вытрымаюць удараў рускіх".

Сярод венгерскіх салдат усе шырэй разпаўсюджваюцца антыгерманскія настроі. Паведамляюць аб наступным факце. Недаўна на станцыі Салнок групай венгерскіх салдат былі жорстка збіты два нямецкіх афіцэры.

Редакцыйная калегія

Выданне Глускага РК КП(б)Б.